Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА «Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
________________Ю.П.Бондар
«_____» ______________2012 г.
Рэгістрацыйны № ВД- ___/вуч.

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ СПЕЦДЫСЦЫПЛІН

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-02 Народная творчасць (інструментальная музыка), спецыялізацыі 1-18 01 01-02 01 Інструментальная музыка народная*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2012

**Складальнікі:**

*В.В.Старыкава,* старшы выкладчык кафедры народна-інструментальнай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства;

*І.Ф.Толкач,* старшы выкладчык кафедры народна-інструментальнай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства

**Рэцэнзенты:**

*Н.Я.Міцуль,* дацэнт кафедры харавога дырыжыравання ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка», кандыдат мастацтвазнаўства;

*Г.С.Мішуроў,* прафесар кафедры духавой музыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар мастацтвазнаўства, прафесар

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* народна-інструментальнай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 19.10.2011 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 06.03.2012 г.)

Адказны за рэдакцыю *В.Б.Кудласевіч*
Адказны за выпуск *В.В.Старыкава*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Сярод вучэбных дысцыплін, якія маюць на мэце прафесійную падрыхтоўку выкладчыка спецінструмента, асноўнае месца займае дысцыпліна «Методыка выкладання спецдысцыплін», якая складаецца з дзвюх частак. Дадзеная праграма з’яўляецца другой, практыка-арыентаванай часткай курса для студэнтаў спецыялізацыі 1-18 01 01-02 01 Інструментальная музыка народная.

Паспяховае вывучэнне методыкі выкладання спецдысцыплін магчыма пры ўмовах комплекснага праходжання і ўзаемадзеяння шэрагу музычна-тэарэтычных і спецыяльных дысцыплін: «Педагогіка», «Агульная псіхалогія», «Узроставая псіхалогія», «Псіхалогія мастацкай творчасці», «Прафесійная педагогіка», «Спецінструмент», «Народна-інструментальная музычная культура Беларусі», «Вывучэнне педагагічнага рэпертуару» і інш.

*Мэтай* вывучэння дысцыпліны «Методыка выкладання спецдысцыплін» з’яўляецца фарміраванне педагагічнага майстэрства будучага выпускніка ў галіне выкладання спецыяльных музычных дысцыплін.

Для паспяховай падрыхтоўкі высокакваліфікаваных выкладчыкаў пастаўлены наступныя *задачы:*

– авалоданне спецыфічнымі асаблівасцямі выкладання спецыяльных дысцыплін;

– выяўленне педагагічных і арганізацыйных здольнасцей студэнтаў;

– развіццё навыкаў работы з вучэбна-метадычнай літаратурай;

– выхаванне прафесійных і эмацыянальна-валявых якасцей студэнтаў;

– фарміраванне мастацкага густу і музычнай культуры студэнтаў.

У выніку навучання студэнт павінен *ведаць:*

– спецыфічныя асаблівасці выкладання спецыяльных дысцыплін у розных тыпах навучальных установаў;

– методыку складання вучэбных і канцэртных музычных праграм;

– асаблівасці методыкі работы над музычным творам на розных этапах;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– вучэбны і канцэртны рэпертуар і сучасную метадычную літаратуру;

– методыку правядзення індывідуальных заняткаў;

*умець:*

– выкладаць музычныя дысцыпліны ў прафесійных і агульных установах музычнай адукацыі, выкарыстоўваць пры гэтым класічныя і сучасныя методыкі;

– працаваць з вучэбна-метадычнай літаратурай;

– праводзіць урокі розных відаў і тыпаў;

– вырашаць з вучнем канкрэтныя мастацкія і тэхнічныя задачы;

– планаваць вучэбны працэс з улікам узросту і ўзроўню падрыхтоўкі вучняў, паслядоўна развіваць у вучня музычныя здольнасці, прафесійныя ўменні і навыкі.

Дадзеная праграма складзена зыходзячы з неабходнасці фарміравання ў студэнтаў тэарэтычных і практычных ведаў па методыцы выкладання спецдысцыплін на ўсіх ступенях музычнай адукацыі.

У ліку эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, спрыяльных уцягванню студэнтаў у пошук і кіраванне ведамі, набыццю вопыту самастойнага рашэння разнастайных задач, варта вылучыць: тэхналогіі праблемна-модульнага навучання; тэхналогія вучэбна-даследчай дзейнасці; камунікатыўныя тэхналогіі; метад аналізу пэўных сітуацый; гульнявыя тэхналогіі і інш.

У мэтах фарміравання сучасных сацыяльна-асобасных і сацыяльна-прафесійных кампетэнцый выпускніка ў практыку правядзення семінарскіх і практычных заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

Для забеспячэння кантролю самастойнай работы студэнтаў пажадана выкарыстоўваць заданні адкрытай формы са свабодна кантралюемым адказам, праблемны і творчыя заданні.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Методыка выкладання спецдысцыплін» усяго адведзена 80 гадзін, з якіх 26 гадзін – аўдыторныя заняткі (20 гадзін – лекцыі, 6 гадзін – семінары). Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўд. гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекц. | практ. |
| Уводзіны | 0,5 | 0,5 | |
| **Раздзел I. Гісторыка-тэарэтычныя асновы выкладання на народных інструментах** | | | |
| *Тэма 1.* Змест курса. Спецыяльныя дысцыпліны ў сістэме музычнай адукацыі | 0,5 | 0,5 | |
| *Тэма 2.* Метадычная літаратура па спецыяльных дысцыплінах | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 3.* Пытанні арганізацыі і планавання вучэбнага працэсу. Методыка падрыхтоўкі і правядзення ўрока па спецдысцыпліне | 1 | 1 | |
| **Раздзел II. Сучасная школа павышэння выканальніцкага майстэрства ў класе спецдысцыплін** | | | |
| *Тэма 4.* Састаўныя кампаненты выканальніцкага апарату музыканта | 2 | 2 | |
| *Тэма 5.* Спосабы гуказдабывання на народным музычным інструменце | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 6.* Асноўныя мастацка-выразныя сродкі музычнага выканальніцтва | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 7.* Методыка работы над музычным творам | 4 | 4 | |
| *Тэма 8.* Асаблівасці засваення вучэбнага і канцэртнага рэпертуару | 2 | 2 | |
| **Разам…** | 26 | 20 | 6 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

Змест і асноўныя патрабаванні дысцыпліны «Методыка выкладання спецдысцыплін». Мэта і задачы дысцыпліны. Фарміраванне педагагічнага майстэрства выпускніка як мэта вучэбнай дысцыпліны. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне. Дысцыпліна «Методыка выкладання спецдысцыплін» сярод іншых агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін. Міжпрадметныя сувязі з іншымі дысцыплінамі

## Раздзел I. Гісторыка-тэарэтычныя асновы выкладання на народных інструментах

### *Тэма 1. Спецыяльныя дысцыпліны ў сістэме музычнай адукацыі*

Фарміраванне выканальніцкай школы ігры на народных інструментах і яе ўплыў на стварэнне сучаснай методыкі выкладання на розных узроўнях спецыяльнай адукацыі.

Значэнне і роля методыкі выкладання ігры на народных інструментах для фарміравання педагагічнага і выканальніцкага майстэрства студэнта.

### *Тэма 2. Метадычная літаратура па спецыяльных дысцыплінах*

Станаўленне і развіццё методыкі выкладання спецыяльных музычных дысцыплін. Сувязь методыкі з гісторыяй выканальніцтва на музычным інструменце. Конкурсы як фактар актывізацыі тэарэтычных даследаванняў выканальніцкіх сродкаў музыканта. Выкарыстанне фартэпіяннай, скрыпічнай і іншых методык у працэсе выкладання спецыяльных музычных дысцыплін.

Асноўныя метадычныя дапаможнікі (у адпаведнасці са спецыялізацыяй). Структура і змест метадычных дапаможнікаў (школы ігры, хрэстаматыі, зборнікі педагагічнага і канцэртнага рэпертуару і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 3. Пытанні арганізацыі і планавання вучэбнага працэсу. Методыка падрыхтоўкі і правядзення ўрока*

Асаблівасці арганізацыі вучэбных заняткаў. Вядзенне вучэбнай дакументацыі. Складанне індывідуальнага плана. Магчымасць яго вар'іравання ў залежнасці ад індывідуальных дадзеных навучэнца. Выкананне індывідуальнага плана і справаздачнасць.

Падрыхтоўка педагога да ўрока – неабходная частка педагагічнай працы. Віды ўрокаў. Задачы і мэты ўрока. Асноўны змест ўрока і яго кампаненты (праверка хатняга задання, сумесная праца педагога з навучэнцам над мастацкім рэпертуарам і інструктыўным матэрыялам, чытанне нот з ліста, паўтор пройдзенага рэпертуару, заданне да наступнага ўрока). Тэматычныя ўрокі і ўрокі творчага музіцыравання (транспанавання, сачынення, падбору на слых і інш.).

Форма праверкі самастойнай працы навучэнца: праслухоўванне твора цалкам з наступнай ацэнкай якасці выканання; ацэнка дасягненняў і аналіз недахопаў ігры вучня; заахвочванне ініцыятывы; зварот увагі навучэнца на агульны характар выканання, на важныя дэталі, на памылкі.

## Раздзел II. Сучасная школа павышэння выканальніцкага майстэрства ў класе спецдысцыплін

### *Тэма 4. Састаўныя кампаненты выканальніцкага апарату музыканта*

Выканальніцкі апарат музыканта як зыходная пастаноўка корпуса і рук музыканта. Агульныя прынцыпы пабудовы выканальніцкага апарату. Асноўныя заканамернасці работы мышцаў і анатама-фізіялагічная будова рук. Роля індывідуальных асаблівасцей вучня пры вызначэнні пастаноўкі.

Спецыфіка пасадкі, становішча інструмента і пастаноўкі рук. Роля выканальніцкага апарату для фарміравання якаснага гучання інструмента. Паступовасць і паслядоўнасць у набыцці навыкаў ігры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма 5. Спосабы гуказдабывання на народным музычным інструменце*

Асноўныя спосабы гуказдабывання на народных інструментах: штуршок, удар, націск і ўзяцце; і іх характарыстыка – фізіялагічны аспект.

Ідэаматорная падрыхтоўка ігравых рухаў і спосабы яе ажыццяўлення. Прынцыпы фарміравання рухальных навыкаў: «павольна і дужа», прынцып прадбачлівасці і хуткага меркавання, прынцып павольнай і дакладнай ігры, шматкратных паўтораў, прынцып маўленчага інтанавання і сальфеджыравання цяжкіх пасажаў і іх характэрныя асаблівасці.

## *Тэма 6. Асноўныя мастацка-выразныя сродкі музычнага выканальніцтва*

Акустычныя асаблівасці фарміравання гуку. Сродкі гуказдабывання. Слыхавы кантроль над гуказдабываннем і сувязь яго з музычна-мастацкім прадстаўленнем. Гукавая дынаміка, гукавыя дыяпазоны інструментаў. Тэмбравае афарбоўванне гуку. Артыкуляцыйныя магчымасці інструментаў. Штрыхі і прыёмы гуказдабывання. Класіфікацыя штрыхоў (легата, нон легата, стаката).

Асновы аплікатуры. Аплікатура як сродак музычнай выразнасці. Прынцыпы выбару аплікатуры. Аплікатура як тэхнічны сродак. Дынаміка як адзін з асноўных элементаў музычнай выразнасці. Тэмп і агогіка. Адзінства тэмпу і магчымасці адхілення ад яго. Фразіроўка. Сродкі фразіроўкі: нюансы, артыкуляцыя, штрыхі, аплікатура.

Паняцце аб інтанацыі ў акустычным і выканальніцка-мастацкім сэнсах. Раскрыццё множнасці розных значэнняў паняцця «інтанацыя»: вышынная арганізацыя музычных тонаў па гарызанталі, манера («лад», «склад», «тонус») музычнага выказвання і г.д.

Равіццё выканальніцкай тэхнікі вучня ў класе спецінструмента і работа над інструктыўным матэрыялам. Роля інструктыўнага матэрыялу для тэхнічнага і мастацкага развіцця музыканта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 7. Методыка работы над музычным творам*

Работа над музычным творам як аснова працэсу навучання ігры на інструменце. Асноўная задача выканаўцы – раскрыццё ідэйна-эмацыянальнага зместу твора, стварэнне на аснове вывучэння нотнага тэксту сваёй выканальніцкай інтэрпрэтацыі. Варыянтная шматлікасць трактовак. Вобразны строй музычнага твора, раскрыццё яго зместу. Выканальніцкі план і шляхі яго рэалізацыі.

Асаблівасці работы над творамі малой і буйной формы. Асноўныя жанравыя разнавіднасці мініяцюр; іх змест, фактура, цэльнасць пабудовы. Усведамленне буйной формы як адзінага цэлага, асэнсаванне асобных эпізодаў у іх узаемасувязі, уменне спалучаць розныя віды тэхнікі выканання.

### *Тэма 8. Асаблівасці засваення вучэбнага і канцэртнага рэпертуару*

Аналіз сучаснага педагагічнага і канцэртнага рэпертуару.

Агульныя метадычныя прынцыпы адбору і сістэматызацыі вучэбнага рэпертуару (па аўтарах, жанрах, тэхналогіі выканання, прыступках цяжкасці, педагагічных задачах і г. д.). Творы розных стыляў і жанраў у вучэбным рэпертуары. Інтэрпрэтацыя музычнага твора: выканальніцкія і метадычныя парады. Асноўныя прынцыпы пералажэння.

Значэнне педагагічнага і канцэртнага рэпертуару ў навучанні музыканта-прафесіянала. Канцэртны рэпертуар як сродак выхавання выканальніцкага майстэрства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Аккордеонно-баянное* исполнительство: вопросы методики, теории и истории / сост. О.М. Шаров. – СПб.: Композитор, 2006. – 136 с.

2. *Андрюшенков, Г.И.* Методика начального обучения игре на балалайке / Г.И. Андрюшенков. – Л.: Музыка, 1983. – 112 с.

3. *Баян* и баянисты: сб. метод. ст. / сост. и общая ред. Ю.Т.Акимова. – М.: Сов. композитор, 1970–1981. – Вып. 1. – 1970. – 150 с.; вып. 2. – 1974. – 128 с.; вып. 3. – 1977. –172 с.; вып. 4. – 1978. – 115 с.; вып. 5. – 1981. –132 с.

4. *Баян* и баянисты: сб. метод. ст. / сост. и общая ред. С. Колобкова, Б. Егорова. – М.: Сов. композитор, 1984. – Вып. 6. – 128 с.

5. *Варфоломос, А.Д.* Музыкальная грамота для баянистов и аккордеонистов / А.Д. Варфоломос. – Л.: Музгиз, 1961–1969. – Вып. 1. – 1961. – 76 с.; вып. 2. – 1962. – 82 с.; вып. 3. – 1963. – 86 с.; вып. 4. – 1964. – 88 с.; вып. 5. – 1966. – 72 с.; 2-е изд. перераб. – Л.: Музыка, 1969.– 264 с.

6. *Гладков, Е.П.* Совершенствование приемов звукоизвлечения и артикуляция при игре на белорусских цимбалах / Е.П.Гладков. – Минск: Выш. шк., 1976. – 40 с.

7. *Жданович, Л.Н.* Некоторые вопросы развития навыка чтения нот с листа у начинающих цимбалистов / Л.Н.Жданович. – Минск: Выш. шк., 1979. – 28 с.

8. *Имханицкий, М.И.* История баянного и аккордеонного искусства: учеб. пособие / М.И. Имханицкий. – М.: РАМ им. Гнесиных, 2006. – 520 с.

9. *Климов, Е.* Совершенствование игры на трехструнной домре / Е.Климов. – М.: Музыка, 1972. – 120 с.

10. *Круглов, В.* Исполнение мелизмов на домре / В. Круглов. – М.: Гос. муз.-пед. ин-т им. Гнесиных, 1997. – 51 с.

11. *Круглов, В.* Совершенствование техники игры на трехструнной домре / В. Круглов. – М.: Гос. муз.-пед. ин-т им. Гнесиных, 1997. – 24 с.

12. *Липс, Ф.Р.* Об искусстве баянной транскрипции: теория и практика / Ф.Р.Липс. – М.: Музыка, 2007. – 134 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

13. *Липс, Ф.Р.* Искусство игры на баяне / Ф.Р. Липс. – М.: Музыка, 1985. – 157 с.

14. *Лысенко, Н.* Методика обучения игре на домре / Н.Лысенко. – Киев: Муз. Украина, 1990. – 97 с.

15. *Максимов, В.А.* Баян: Основы исполнительства и педагогики : Психомоторная теория артикуляции на баяне : пособие для учащихся и педагогов музык. шк., училищ, вузов / В.Максимов. – СПб.: Композитор, 2003. – 255 с.

16. *Осмоловская, Г.* Обучение игре на домре. Вопросы теории и методики / Г.Осмоловская. – Минск: Белорус. гос. акад. музыки, 2001. – 48 с.

17. *Осмоловская, Г.В.* Активизация музыкального слуха при обучении игре на домре / Г.В. Осмоловская. – Минск: Выш. шк., 1981. – 28 с.

18. *Прадед, В.* Рационализация игровых движений цимбалиста: практ. пособие / В.Прадед. – Минск: Книгосбор, 2009. – 48 с.

19. *Свиридов, Н.М.* Основы методики обучения игре на домре / Н.М. Свиридов. – Л.: Музыка, 1968. – 76 с.

20. *Ставицкий, З.* Начальное обучение на домре / З.Ставицкий. – СПб.: Музыка, 1984. – 64 с.

21. *Хитрин, Н.* Методика освоения тремоло / Н. Хитрин. – СПб.: Союз художников, 2004. – 23 с.

22. *Черняк, Л.И.* Вопросы истории и теории домрового исполнительства (на материале произведений белорусских композиторов) / Л.И Черняк. – Минск: БГАМ, 2006. – 48 с.

23. *Шахов, Г.И.* Игра по слуху, чтение с листа и транспонирование (баян, аккордеон) : учеб. пособие / Г.И. Шахов. – М.: Гуманитар. изд. центр ВЛАДОС, 2004. – 224 с.

24. *Щербак, В.М.* Принципы организации исполнительского аппарата домриста / В.М. Щербак // Весці Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. – Мінск: Беларус. дзярж. акадэмія музыкі, 2001. – Вып. 1. – С. 106 – 111.

25. *Щербак, В.М.* Принципы формирования исполнительского аппарата балалаечника / В.М. Щербак. – Минск: ЛУЗИ МК БССР, 1979. – 50 с.

*Дадатковая*

1. *Ауэр, Л.* Моя школа игры на скрипке. Интерпретация произведений скрипичной классики / Л. Ауэр. – М.: Музыка, 1965. – 138 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Браудо, И.* Артикуляция (О произношении мелодии) / И.Браудо. – 2-е изд. − М.: Музыка, 1973. − 198 с.

3. *Вицинский, А.В.* Процесс работы пианиста-исполнителя над музыкальным произведением: психологический анализ / А.В.Вицинский. – М.: Классика, 2003. – 96 с.

4. *Коган, Г.* Работа пианиста / Г.Коган. – М.: Музыка, 1979. – 184 с.

5. *Гинзбург, Л.С.* О работе над музыкальным произведением / Л.С. Гинзбург. – 4-е изд. – М.: Музыка, 1981. – 143 с.

6. *Савшинский, С.И.* Работа пианиста над музыкальным произведением / С.И. Савшинский. – М.: Классика-XXI, 2004. – 191 с.

7. *Гофман, И.* Фортепианная игра. Ответы на вопросы о фортепианной игре / И. Гофман. – М.: Музгиз, 1961. – 268 с.

8. *Милич, Б.Е.* Воспитание ученика-пианиста / Б.Е.Милич. – М.: Кифара, 2002. – 119 с.

9. *Ширинский, Л.А.* Штриховая техника скрипача / Л.А.Ширинский. – М.: Музыка, 1983. – 86 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

*1 (адзін)* – адмова ад адказу на экзамене.

*2 (два)* Адказ на нездавальняючым узроўні. Студэнт не мае ніякіх уяўленняў аб галоўных паняццях методыкі выкладання спецдысцыплін.

*3 (тры)* – адказ на нездавальняючым узроўні з істотнымі памылкамі. Студэнт мае прыблізныя, агульныя ўяўленні аб асноўных паняццях методыкі выкладання спецдысцыплін. Пры адказе дапускае шмат прынцыповых памылак.

*4 (чатыры)* – адказ на здавальняючым узроўні. Веды студэнта няпоўныя, але дапушчаны сур'ёзныя памылкі ў адказе.

*5 (пяць)* – адказ на невысокім прафесійным узроўні. Студэнт прадэманстраваў веданне агульных паняццяў, але мае несістэматызаваныя веды.

*6 (шэсць)* – адказ на добрым узроўні. Студэнт валодае тэарэтычным матэрыялам няпоўна, робіць памылкі, недасканала валодае практычнымі навыкамі і ўменнямі.

*7 (сем)* – адказ на добрым прафесійным узроўні. Студэнт паказвае валоданне тэарэтычнымі ведамі і можа іх скарыстаць на практыцы. Студэнт выяўляе недастатковую дасканаласць у адным з раздзелаў курса.

*8 (восем)* – адказ на дастаткова высокім узроўні. Студэнт добра валодае тэарэтычнымі і практычнымі навыкамі і ўменнямі.

*9 (дзевяцъ)* – адказ на высокім узроўні. Студэнт валодае глыбокімі сістэмнымі тэарэтычнымі ведамі і практычнымі навыкамі па методыцы выкладання спецдысцыплін.

*10 (дзесяцъ)* – адказ на вельмі высокім узроўні. Студэнт дэманструе яркі адказ з паказам самастойна вывучанага матэрыялу па методыцы выкладання спецдысцыплін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі кампетэнцыі студэнта**

– адкрытыя урокі;
– вуснае апытанне ў час заняткаў;
– тэставыя заданні;
– заданні для самастойнай работы;
– кантроль самастойнай працы;
– экзамен;
– дзяржаўны экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ СПЕЦДЫСЦЫПЛІН**

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-02 Народная творчасць*
*(інструментальная музыка), спецыялізацыі 1-18 01 01-02 01*
*Інструментальная музыка народная*


Карэктар В.Б.Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л.М.Мельнік

Падпісана ў друк 2012. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,90. Ул.-выд. арк. 0,73. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ